# ДАЙДЖЭСТ

## ЛГБТ-ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯХ

**Аўтар: GPress.info**

**II квартал 2021 года**

II квартал бягучага года характарызуецца ўмераным асвятленнем ЛГБТК+-тэматыкі ў беларускіх незалежных медыях. Прыемна канстатаваць выкарыстанне ў матэрыялах карэктнай лексікі.

Сярод навінаў – змена дызайну і адрасу сайту gaypress.eu. Новы сайт знаходзіцца па адрасе https://gpress.info/.

Як і раней, магчыма набыць вясёлкавы сцяг у беларускай інтэрнэт-краме.

З нечаканак гэтага квартала – знаходка сайту ў беларускай даменнай зоне, у якім прадстаўленая гэтак званая ЛГБТ яой (слэш) тэматыка.

Непрыемнай нечаканасцю сталася з’яўленне ў медыяпрасторы сайту “Беларускага славянскага камітэта”, на мапе якога пазначана агульная тэрыторыя, якая ўключае ў сябе РФ, Украіну, Беларусь, Польшчу і іншыя краіны.

Адзін з раздзелаў на сайце называецца наступным чынам: “Прадстаўляем Вашай увазе падборку фільмаў для разумення якія пагрозы нясе чалавецтву і беларусам глабалізаацыя”. У гэтай падборцы ўказваецца фільм “Забыццё веры: шведская епіскап-лесбійка хоча зняць крыжы з цэркваў ва ўгоду мусульманам”.

**Сваеасаблівай сенсацыяй II квартала 2021 года ў асвятленні ЛГБТК+-тэматыкі беларускімі медыямі сталася актыўнасць у гэтай сферы дзяржаўных СМІ.**

Адзін з слупоў дзяржпрапаганды – тэлеканал АНТ у красавіку размясціў у сябе на сайце яўна нехарактэрны тэкст (паводле тэматыкі і нейтральнасці прэзентацыі): “Гэтыя знакамітасці змянілі пол! Вы будзеце шакаваныя!”.

Былі прадстаўленыя фота замежных зорак і іх сціслая гісорыя па змене полу.

Праз некаторы час з’явіўся яшчэ адзін цікавы тэкст на іншым прапагандысцкім сайце.

БелТА – галоўная праўладная інфармацыйная агенцыя – не была заўважаная да гэтага ў асвятленні тэматыкі ЛГБТК+. І вось з'яўляецца навіна "Лаліта прымерыла яркі купальнік і зрабіла моцную заяву". У тэксце гаворыцца: "Лаліта прымерыла яркі купальнік і напісала: "Прашу лічыць мяне ў гэтым купальніку абразом ЛГБТ"".

Навіна прадстаўленая ў раздзеле, які публікуе свецкую кроніку і падобныя матэрыялы.

---

У чэрвені БТ-1 у навінах паказвае адразу два сюжэты на ЛГБТ-тэматыку:

Мінабароны ЗША адмовілася вывешваць сцягі ЛГБТ-супольнасці,

Венгрыя прыняла закон пра забарону прапаганды ЛГБТ – Еўропа пакрыўдзілся.

А ў вечаровай праграме "Галоўны эфір" паказваюць сюжэт з такой назвай: "Гвалтоўная ЛГБТ-талерантнасць: як Захад маніпулюе Літвой і Украінай?".

Нечакана гэты сюжэт размяшчаюць на сайтах адразу некалькіх раённых газетаў. Такая тэматыка яўна нехарактэрная для гэтых СМІ, асноўныя тэмы якіх – становішча ў іх раёне.

Па-за тым, сюжэт з БТ-1 з'явіўся на сайтах "Лунінец online", "Pinsknews.by", "Раённые будні" (г. Пружаны).

Акрамя гэтых узгадак ЛГБТК+-тэматыкі, быў заўважаны яшчэ адзін артыкул у газеце "Советская Белоруссия", які ставіў на мэце дыскрэдытаваць Вольгу Карач. (Падрабязнасці ніжэй.)

Навідавоку выкарыстанне ЛГБТК+-тэматыкі для прапаганды. БелТА і АНТ падалі інфармацыю нейтральна. Што гэта? Пробны шар? Тэставанне рэакцыі?

Відаць, аўдыторыя не стала звяртаць увагі на гэтыя тэксты і ёй вырашылі "патлумачыць, як правільна" ставіцца да ЛГБТК+.

---




## Чужы дом. Сеанс з выкрыццём

“Прадстаўляю вам выбітную апазіцыйную дзяячку Вольгу Карач. Чаго толькі вартая хаця б яе парада маладым людзям – прыкідвацца геямі, каб не хадзіць у войска. Але да метадаў Карач яшчэ вернемся…

Яна займаецца практычна ўсімі кірункамі, пад якія магчыма атрымаць грошы. Урбаністыка, жытло, грамадскі транспарт, геі, лесбійкі, трансгендары, ахова здароўя, палітычныя зняволеныя, дзеці, наркаманы, інваліды…”



## Пра ЛГБТ, прыгнечаных, абражаных, фарбаваныя валасы, фемінітывы, зумераў, трэнды цік-тока і што там вас яшчэ напружвае

“Няма ніякага сэнсу змагацца з навязваемай ЛГБТ-павесткай, тым больш можна спажыць макароны. Ніколі свет не зруйнуеццца ад таго, што грамадства знаходзіць важныя для дыскусіі тэмы, якія ўспыхваюць у тых месцах, дзе адна частка хоча адмовіцца ад усяго старога, а другая баіцца ўсяго новага.”




## Расійская ЛГБТ-актывістка затрыманая ў аэрапорце Мінска за жарт пра траціл

“Юрыстка Самарскага грамадскага руху ЛГБТ “Аверс” Марыя Рымар была затрыманая ў Нацыянальным аэрапорце Мінск за тое, што няўдала пажартавала пра траціл, паведамілі праваабаронцы.”



**“Не хацелася чуць абвінавачанні, што з-за ЛГБТК-сцягоў пратэст прайграе”. Гэта дзяўчына зняла фільм “Каханне”, які варта паглядзець усім**

“У сакавіку выйшаў фільм “Каханне” Дар’і Трайдэн і Дар’і Барышнікавай. Гэта стужка – пра каханне, пратэсты і гамафобію. Рэжысёрка Дар’я Трайдэн распавяда пра здымкі, Акрэсціна і каментары беларусаў.”



**Я зразумеў, што гей, бо мяне цягнула больш да хлопцаў**

“Араз нарадзіўся і вырас у Туркменістане, вучыўся ў Беларусі, а цяпер жыве ў Нямеччыне. Ён распавядае, як геі жывуць у трох розных краінах.”



**Цацкі-антыстрэс: разнявольваюць або стамляюць?**

“Дарэчы, у некаторых краінах узнялі пытанне пра тое, каб забараніць сімпл-дымпл. Аргумент: на думку крытыкаў, цацка прапагандуе ЛГБТ.”.



## “Дзіка чуць ад сяброў: “Прабач, але мы будзем кідаць у цябе гранаты.”” Як гэта быць адкрытай лесбійкай

“Вера – лесбійка, на момант гутаркі ёй 22 гады. Не так даўна яна пераехала ў Мінск з Адэсы. Дзяўчына падзялілася думкамі пра тое, як жывецца ЛГБТ-людзям у Беларусі і ва Украіне.”




## Што прапануюць змяніць у Канстытуцыі Беларусі

“Два тэрміны для прэзідэнта, адмена смяротнага пакарання, забарона на гей-шлюбы: якія папраўкі ў Канстытуцыю Беларусі прапануюць партыі і грамадскія аб’яднанні.”




## “На вейкі да інжынера. Як мужчыны з Гародні працуюць у сферы прыгажосці”

Максим Пальчыкаў стаў майстрам па педыкуры пасля таго, як зрабіў масаж ног жонцы напрыканцы цяжкога працоўнага дня…

Па сканчэнні курса Максім першай справай зрабіў сабе майку з надпісам “Я не гей”.










**Разгляд закона аб прапагандзе і важкасць бяспечных прастораў: як цяпер ідуць справы ў беларускай ЛГБТ+ супольнасці**

“Мы закранем яшчэ адну важную для нашага грамадства тэму: жыццё і дзейнасць ЛГБТКІАП+-людзей у Беларусі.

**Запусціўся падкаст “Квір курылка” – пра ЛГБТК+, пратэсты, самаклопат**

Моладзевы савет «РАДА» запусціў падкаст «Квір курылка» – ён пра Беларусь, пратэсты, самаклопат і квір. Шоу ствараецца пры ўдзеле Андрэя Завалея, каардынатара кампаніі «Справа Пі_», і журналіста_ка і пісьменніка_цы Тоні Лашдэн.

**Перамены, любоў да сябе і Менск - вось 7 беларускіх подкаст, якія вам таксама варта паслухаць**

«Квір Курылка»: пра ЛГБТК, але не толькі Хто робіць?

Падкаст робяць ЛГБТК-актывісты Тоні Лашден і Андрэй завалаў. У абодвух - шматгадовы вопыт прыняцця сябе, актывізму і жыцця ў не самай талерантнай да ЛГБТК-культуры краіне.



## З агню ды ў полымя: трансгендара з Маладзечна, які сядзіць у расійскай турме, экстрадуюць у Беларусь

"Паводле інфармацыі праваабаронцаў, прынята рашэнне пра экстрадаванне Назара Гулевіча ў Беларусь у дзень яго вызвалення."



## "Як не выхаваць дзіця гомасэксуалістам"

"Шмат артыкулаў прысвечана таму, як не выхаваць дзіця з гомасэксуальнымі схільнасцямі, як распазнаць на раннім тэрміне няправільную арыентацыю свайго дзіцяці і як разабрацца ў прычынах яе ўзнікнення."



Запрашаем на абноўлены

**Gay Press!**

GPress.info

**Мы ў сацыяльных сетках**

**Telegram**

**Facebook**

**Instagram**

**ВКонтакте**

**Яндекс.Дзен**

**TikTok**

**YouTube**

**Twitter**

**E-mail: GayPresseu@gmail.com**

GPress.info